**Заключение.** Проведенный анализ позволяет сделать ряд обобщений относительно грамматических особенностей выражения одоронимов в парфюмерном интернет-дискурсе. Данный тип дискурса характеризуется сочетанием черт научного, медийного и речевого стилей. Грамматические и синтаксические особенности комментариев (использование сложных синтаксических конструкций в русскоязычном сегменте и прагматически ориентированных структур в англоязычном) отражают различные коммуникативные стратегии авторов. Широкое использование неполных предложений сближает письменный интернет-дискурс с устной речью, обеспечивая эффект непосредственного общения.

1 Perfume Encyclopedia : [сайт]. – Сан-Диего, 2016. – URL: https://www.fragrantica.com/ (дата обращения: 02.03.2026). – Режим доступа: для зарегистрированных пользователей. – Текст : электронный.
2 Павлюк, Т. П. Семантико-когнитивные особенности вербализации парфюмерных запахов в интернет-отзывах русско- и англоязычного интернет-дискурса / Т. П. Павлюк, З. А. Дубинец // Неофилология. - 2025. - Т. 11, № 4. – С. 903–915.
3 Основы современной лингвистики: курс лекций / сост. В. А. Маслова. – Витебск, 2018. – URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/17416 (дата обращения: 02.03.2026). – Текст: электронный.
4 Танабаева, И. Р. Синтаксические особенности текста в жанре комментария / И. Р. Танабаева // Молодой ученый. – 2019. – № 16 (254). – С. 318–320.

## МОЎНА-СТЫЛІСТЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ВЕРША АЛЕНЫ БАГАМОЛАВАЙ «ЗІМА»

***Бычкова А.М.,***
*магістрантка 1 года навучання ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Семянькова Г.К., канд. філал. навук, дацэнт

У сучасным мовазнаўстве ўзрастае цікавасць да вывучэння ідыястылю пісьменнікаў. Аналіз моўна-стылістычных асаблівасцей твора дазваляе глыбей зразумець аўтарскую задуму і вызначыць агульны кірунак развіцця літаратуры ў пэўны перыяд. Асаблівую значнасць у гэтым кантэксце набывае даследаванне творчасці асобных сучасных аўтараў.

Алена Багамолава – вядомая беларуская пісьменніца і мовазнаўца, аўтар паэтычных твораў і лірычных мініяцюр. У 2008 годзе свет убачыў яе паэтычны зборнік «Рэха сустрэчы». На сённяшні дзень поўны лінгвастылістычны аналіз паэтычных твораў Алены Багамолавай адсутнічае, таму *актуальнасць* нашага даследавання з’яўляецца відавочнай і заключаецца ў магчымасці ахарактарызаваць моўна-стылістычныя асаблівасці верша «Зіма», што дазволіць выявіць адметныя рысы ідыястылю пісьменніцы, спецыфіку стварэння мастацкіх вобразаў і перадачы аўтарскіх пачуццяў. *Мэта* даследавання – выяўленне і характарыстыка моўна-стылістычных асаблівасцей верша Алены Багамолавай «Зіма», вызначэнне ролі вобразна-выяўленчых сродкаў у тэксце.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для даследавання з’яўляецца верш Алены Багамолавай «Зіма», змешчаны ў зборніку «Рэха сустрэчы» [1, с. 4-5]. Падчас аналізу былі выкарыстаны структурны, функцыянальны і апісальны метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У вершы «Зіма» Алена Багамолава стварае вобраз зімовай пары, якая паўстае адначасова ў сваёй прыгажосці і жорсткасці. Аўтарка не толькі малюе зімовы пейзаж, але і перадае хуткі прыход вясны. Рыфма дапамагае стварыць гарманічнае гучанне мастацкага тэксту, падкрэсліць цэласнасць вобразаў, перадаць зімовы пейзаж.

Свае пачуцці Алена Багамолава перадае праз шматлікія вобразна-выяўленчыя сродкі. Так, эпітэты, якія пісьменніца ўжывае ў вершы, дапамагаюць больш выразна апісаць зіму. У прыкладзе *колкім (снегам)* эпітэт апісвае снег як дробны, халодны, востры. Гэты эпітэт перадае настрой лірычнага героя. У прыкладзе *белазорным (снегам)* апісваецца снег як беласнежны, пераліўны і бліскучы. Эпітэты, выкарыстаныя аўтарам, дапамагаюць стварыць яркія і запамінальныя вобразныя карціны, дазваляюць чытачу адчуць зімовую атмасферу.

Ужытыя пісьменніцай параўнанні выяўляюць аўтарскія адносіны да зімы: *Сыпле колкім снегам у маё акно, /* ***Нібы студзіць-замятае ўспаміны***, малююць карціну, дзе снег замятае мінулыя ўспаміны і думкі, стварае новае, чыстае палатно. Метафары, якія выкарыстоўваюцца пісьменніцай, дапамагаюць прывесці чытача ў неабходны эмацыйны стан. Напрыклад, метафара ***Кружыць-круціцца зімы верацяно / Не спыняецца ні на хвіліну*** перадае характар пастаяннага руху зімы, стварае вобраз бесперапыннасці.

У прыкладзе ***Просяцца са снегам у акно / Сінія пралескі і зялёны лес, / Белая чаромха, белы бэз*** увасабленне стварае яркі кантраст паміж снегам і рознакаляровай прыродай, пра якую думае аўтар, успамінаючы іншую пару года, дадае фарбаў і жвавасці вобразу. Зіма асацыюецца з холадам, снегам, марозам, у той час як вясна – з цяплом, сонцам, зелянінай. Гэты кантраст дапамагае перадаць пачуццё жадання прыходу вясны.

Праз сродкі стварэння выразнасці пісьменніца перадае свае адчуванні. Сінонімы, якія ўжываюцца ў творы, надаюць мове тэксту шматфарбнасць, выразнасць, робяць яе багатай, жывой: ***Кружыць-круціцца*** *зімы верацяно.* ***Сыпле*** *колкім снегам у маё акно, / Нібы* ***студзіць-замятае*** *ўспаміны*. Выкарыстаныя ў вершы антонімы ўпрыгожваюць і дапаўняюць змест мастацкага тэксту: ***Кружыць-круціцца зімы верацяно: / І зямлю, і неба /*** *Замяло.* Антонімы апісваюць супрацьлеглыя бакі прыроды, ствараюць кантраст, падкрэсліваючы разнастайнасць і складанасць свету.

Алітарацыя свісцячых [ц’], [ц], [з’], [з], [с’], [с] і дрыжачага [р] стварае асацыяцыю з гукамі прыроды. Гучанне верша нагадвае адчуванне свісту і руху, што перадае характар зімовага надвор’я. Гэты прыём стварае ў тэксце гукавую гармонію і рытм.

Рэфрэн ***Кружыць-круціцца зімы верацяно*** падкрэслівае не толькі пастаянства і рэгулярнасць зімы, але і вечны ход часу. Недаказ ***Кружыць-круціцца зімы верацяно: / І зямлю, і неба / Замяло...*** выкарыстаны ў мастацкім творы для перадачы нясконачанасці выказвання, што прыцягвае ўвагу чытача і дае магчымасць паразважаць над працягам думкі.

Вокліч ***Ах, якое дзіўнае за шклом кіно!*** узмацняе эмацыйны настрой выказвання, што дапамагае падкрэсліць незвычайнасць і загадкавасць зімовага пейзажу за акном. Вокліч дапамагае ўзмацніць вобраз малюнка, які бачыць лірычны герой за шклом, апісвае зімовы пейзаж як фільм, што надае твору асаблівую магію і маляўнічасць.

Верш насычаны дзеясловамі ў форме абвеснага ладу: *кружыць, круціцца, не спыняецца, студзіць, замятае, не ведае, просяцца, замяло*. Дзеясловы дапамагаюць чытачу візуалізаваць і адчуць зімовы пейзаж, яны перадаюць яго прыгажосць, манатоннасць, загадкавасць і таямнічасць праз яркія вобразы і эмацыйныя адценні. Выкарыстанне дзеясловаў у абвесным ладзе не толькі ўзмацняе ўспрыняцце верша, але і запрашае чытача пагрузіцца ў свет эмоцый і адчуванняў, выкліканых зімовым пейзажам.

Перадачы агульнага настрою верша дапамагаюць выкарыстаныя назоўнікі *зіма, верацяно, снег, успаміны, акно, пралескі, лес, чаромха, бэз, кіно, зямля, неба*, якія ствараюць зімнюю атмасферу, перадаюць яе прыгажосць, холад, загадкавасць.

**Заключэнне.** Такім чынам, у вершы «Зіма» праз багатую сістэму лексічных асаблівасцей Алена Багамолава стварае яркія і запамінальныя вобразы, якія дазваляюць акунуцца ў магічную атмасферу апісанага пейзажу. Гукавыя прыёмы надаюць тэксту музычнасць, меладычнасць, узмацняюць эмацыянальнае яго ўспрыманне. Гэта садзейнічае больш глыбокаму разуменню зімы як часу змен і аднаўлення. Аўтар умела спалучае апісанне розных аб’ектаў прыроды, ствараючы шматгранны вобраз зімы, які застаецца ў памяці чытача надоўга.

1 Багамолава, А. М. Рэха сустрэчы : вершы / Алена Багамолава. – Мінск : А. М. Вараксін, 2008. – 64 с.

2 Рагойша, В.П. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах : дапам. / В.П. Рагойша. – Мн.: Беларуская энцыклапедыя, 2001. – 384 с.

3 Стылістыка мастацкага тэксту : метадычныя рэкамендацыі / склад. Г.К. Семянькова. – Тэкст: электронны // Рэпазіторый ВДУ імя П.М. Машэрава. – URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/28226 (дата звароту: 26.02.2026). – Электр. копія друк. выд.: Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2021. 47 с.